

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## КНІГА ЗАПАТРАБАВАНАЯ І Ў ВЕК ГАДЖЭТАЎ

**Кніга не губляе сваёй прывабнасці і ў век электронных сродкаў масавай інфармацыі, гаджэтаў, застаецца запатрабаванай чытачамі. Такое меркаванне выказаў на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў 56-га нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», што адбылася ў межах Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмаша, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**



Фота БЕЛТА.

Паводле слоў спікера верхняй палаты, выстаўка, на якой прысутнічае такая вялікая колькасць наведвальнікаў, пацвярджае, што кніга была, ёсць і будзе важным элементам у жыцці людзей, а цяга чытачоў да друкаванага выдання не слабее. Гэта крыніца ведаў, наша гісторыя, наша культура. Кніга была і застаецца нацыянальным здабыткам, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

## ВІЗІТ СКОНЧАНЫ — ДАМОЎЛЕНАСЦІ ДАСЯГНУТЫ

**У мінулы чацвер завяршыўся афіцыйны візіт у Іран беларускай парламенцкай дэлегацыі.**

Падчас візіту дэлегацыя наведала інжынерна-даследчую іранскую фармацэўтычную кампанію Tofigh Daru. У ходзе сустрэчы была пацверджана яе гатоўнасць развіваць дзелавыя сувязі з кампаніямі Рэспублікі Беларусь. Бакі абмеркавалі магчымасць лакалізацыі вытворчасці на тэрыторыі нашай краіны як шляхам стварэння сумеснага прадпрыемства, так і за кошт наладжвання супрацоўніцтва паміж фармацэўтычнымі прадпрыемствамі Ірана і Беларусі.

Акрамя таго, беларуская дэлегацыя наведала кампанію «Азхайтэкс» (Тэбрыз), якая з 2009 года з'яўляецца афіцыйным дылерам Мінскага аўтамабільнага завода ў Іране. У 2011 годзе ў гэтай кампаніі адкрыта зборачная вытворчасць аўтамабіляў МАЗ. За перыяд супрацоўніцтва бакоў у Іран было пастаўлена звыш 500 адзінак аўтатэхнікі. А падчас сустрэчы Міхаіла Мясніковіча з міністрам прамысловасці, шахтаў і гандлю Ірана, якая адбылася напярэдадні, была пацверджана зацікаўленасць Ірана ў далейшым набыцці тэхнікі МАЗ. Члены нашай дэлегацыі азнаёміліся з работай іранскага прадпрыемства, а таксама прынялі ўдзел у адкрыцці лініі па зборцы аўтобусаў.

## ПРАДУХІЛІЦЬ НЕБЯСПЕКУ. РАДЫЯЦЫЙНУЮ

**У Гомелі пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандра ПАПКОВА прайшло выязное пасяджэнне камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Падчас яго парламентарыі абмеркавалі практыку прымянення законаў Рэспублікі Беларусь «Аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва» і «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».**

Удзельнікі пасяджэння ўзнялі шэраг пытанняў аб удасканаленні сістэмы радыяцыйнага кантролю і маніторынгу радыеактыўнага забруджвання навакольнага асяроддзя, медыцынскім наглядзе насельніцтва і санаторна-курортным лячэнні дзяцей, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, прымяненні ахоўных мер у сельскагаспадарчай галіне, выкарыстанні зямельных і лясных рэсурсаў, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і стварэнні новых вытворчасцяў.

*(Больш падрабязна пра гэта чытайце ў наступным нумары «МС».)*

## ЯК БЫЦЬ З НЕПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНЫМІ?

**У мінулую пятніцу ў Магілёве старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ правёў круглы стол аб ролі і месцы інстытута эканамічнай неплацежаздольнасці ў фінансавым аздараўленні прадпрыемстваў.**

Удзельнікамі пасяджэння былі разгледжаны ўнесены ў Палату прадстаўнікоў законапраект «Аб неплацежаздольнасці і банкруцтве» і выпрацаваны прапановы па яго ўдасканаленні. У рамках круглага стала парламентарыі наведалі Магілёўскую швейную фірму «Вяснянка» і Магілёўскі завод «Строммашына», якія цяпер праходзяць працэдуру санацыі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# ЦІ ПАТРЭБНЫ ЎРАЧАМ ПАТЭНТЫ?

## Гэту тэму абмяркоўваюць у Палаце прадстаўнікоў

**Аказваецца, у пэўных сферах, прынамсі, у медыцынскай, патэнты ўяўляюць сабой не такое простае пытанне. Наяўнасць патэнтаванага спосабу лячэння пэўнага захворвання, безумоўна, робіць канкрэтнага ўрача больш прывабным для пацыентаў. У той жа час іншыя яго калегі з-за гэтага патэнта не маюць права карыстацца адпаведным спосабам, а пакутуюць пацыенты. Калі ж патэнты адмяніць, то можа зменшыцца экспарт медыцынскіх паслуг...**



Сітуацыю пракаментавала **Таццяна ЯКУБОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы**. Яна расказала, што сёння дэпутаты камісіі працуюць над праектам закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях патэнтаў на вынаходкі, карысныя мадэлі і прамысловыя ўзоры».

Ужо прайшло пасяджэнне працоўнай групы па гэтым законапраекце, якое, па словах парламентарыя, аказалася вельмі дыскусійным.

— Дэпутат нашай камісіі ўнёс прапанову наконт таго, каб метады аказання медыцынскай дапамогі прызнаваліся патэнтаздольнымі, — тлумачыць Таццяна Якубовіч. — Пад такімі метадамі мы разумеем пратэзаванне, медыцынскую рэабілітацыю. Калі сказаць простай мовай, то патэнтныя вынаходкі ў прамысловасці маюць, як правіла, вельмі сур'ёзны эканамічны эфект. Вынаходнікі атрымліваюць патэнт, потым — ліцэнзію. Безумоўна, пасля яны зарабляюць на гэтым грошы. У медыкаў патэнт не прыносіць камерцыйнай карысці, а з'яўляецца больш маральным фактарам, важным для саіскальнікаў, дактарантаў і аспірантаў...

У якасці прыкладу парламентарый прывяла такую сітуацыю: у нашай краіне шмат хірургаў вельмі высокага класа, якія выконваюць тую ці іншую аперацыю. Ёсць хірургі, якія пэўныя спосабы правядзення пэўнай аперацыі вынайшлі першымі — такія вынаходкі неабходна патэнтаваць. Яшчэ гэта звязана, безумоўна, з экспартам медыцынскіх паслуг. Калі ў рэспубліканскага цэнтра шмат патэнтаў, любы замежнік можа адшукаць інфармацыю пра гэта ў інтэрнэце і адразу выбраць, у якую медыцынскую ўстанову, да якога дакладна ўрача хоча прыехаць лячыцца.

— Мы толькі пачалі працаваць над гэтым законам і ўжо сёння падрыхтавалі пісьмы ва ўсе рэспубліканскія медыцынскія цэнтры, у вышэйшую атэстацыйную камісію Рэспублікі Беларусь, а таксама ў Міністэрства аховы здароўя, каб сур'ёзна прапрацаваць гэтае пытанне, — адзначае дэпутат. — Парламентарыі ж хочуць, каб медыцынскія тэхналогіі былі даступныя для ўсіх. Неабходна зрабіць так, каб патэнты не перашкаджалі ўрачам якасна працаваць і ў той жа час ігралі на руку айчыннаму экспарту.

Сёння Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Еўразійскай патэнтнай канвенцыі, якую падпісалі 8 дзяржаў. Ёсць магчымасць атрымаць адзіны патэнт, які будзе дзейнічаць на тэрыторыі гэтых дзяржаў. У краінах далёкага замежжа нашы патэнты на аказанне медыцынскіх паслуг не дзейнічаюць, хоць нашы суседзі, з якімі мы шчыльна супрацоўнічаем, — Расія і Украіна — іх прызнаюць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by
**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** yurgel@zviazda.by
**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

### КАМЕНТАРЫІ Ў ТЭМУ:



**Таццяна КАВАЛЕЎСКАЯ, начальнік упраўлення права і міжнародных дагавораў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці:**

—У 2016 годзе Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці прыняў 521 заяву на выдачу патэнтаў на вынаходку. З іх 65 заявак паступіла ад установ Міністэрства аховы здароўя, прычым 51 заява адносілася да рэгістрацыі новых спосабаў лячэння.

Што такое патэнт? Гэта ахоўны дакумент, які засведчвае выключнае права на вынаходку, аўтарства і прыярытэт вынаходкі перад іншымі распрацоўкамі.

Адно з асноўных прызначэнняў патэнта — гэта камерцыялізацыя вынаходкі. Напрыклад, калі новы метад лячэння акажацца цікавым для выкарыстання, то паміж уладальнікам патэнта і зацікаўленай асобай заключаецца ліцэнзійны дагавор на выкарыстанне вынаходкі, і патэнтаўладальнік атрымлівае грашовую ўзнагароду за тое, што нехта карыстаецца яго вынаходкай.

У той жа час, калі запатэнтаванае новаўвядзенне не выклікае інтарэсу альбо патэнтаўладальнік не выводзіць яго на рынак, адбываецца растрачванне сродкаў, бо ўвесь тэрмін дзеяння патэнта праваўладальнік павінен падтрымліваць яго ў сіле шляхам аплаты неабходнай пошліны. Але часта бывае так, што ахоўны дакумент атрымліваюць толькі для абароны навуковай ступені, а потым ён, умоўна кажучы, вісіць на сцяне. Так быць не павінна, бо на афармленне праў на патэнт трэба затраціць каля 400 долараў. Такім чынам, яшчэ да атрымання патэнта, у тым ліку за дзяржаўныя сродкі, трэба разумець, як потым будзе выкарыстоўвацца вынаходка і які прыбытак ад гэтага змога атрымаць патэнтаўладальнік.

**Алег РУМО, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, намеснік галоўнага ўрача па хірургічнай рабоце 9-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

— Патэнт — гэта ахоўздольнасць метадаў лячэння (калі гэта патэнт не на прыладу). Што такое ахоўздольнасць? Напрыклад, я вынайшаў пэўны спосаб лячэння, і толькі я ім карыстаюся. А як быць, калі пацыент да мяне ў чаргу не трапіць, ці людзей на прыём занадта шмат, ці раптам чалавека завязуць у іншую бальніцу? Я не дазволю іншай бальніцы рабіць аперацыю, бо ў мяне патэнт на лячэнне сваімі метадамі? Таму даўным-даўно ў Еўропе не патэнтуецца метад лячэння, зыходзячы з этычных нормаў і па шмат якіх іншых фактарах, але галоўны менавіта гэты. А інструкцыя на метад лячэння і аказання дапамогі, якая прымаецца міністэрствам аховы здароўя, дае права выкарыстоўваць гэту методыку ва ўсіх лячэбных установах краіны, такім чынам не выдзяляючы дактароў.

Яшчэ адзін важны момант, што асноўная маса гэтых метадаў вынаходзіцца не «гледзячы ў столь», а за грошы, што выдзяляюцца дзяржавай альбо камітэтам па навуцы і тэхналогіях. Атрымліваецца, дзяржава заплаціла, доктар метад — за кошт чужых сродкаў — стварыў, а пасля яго сабе прысвоіў? Таму сёння прынята рашэнне патэнтаваць новыя метады лячэння пасля зацвярджэння адпаведнай інструкцыі. Што датычыцца ўстройстваў (прылад), то калі ласка — любы доктар можа вынайсці яго і праводзіць лячэнне з яго дапамогай.